# РУБЕЛЬ НАСТУПАЕ ПА ЎСІХ «ФРАНТАХ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Часам рублёвыя дэпазіты на тэрмін больш за год маюць камбінаваны механізм працэнтнай стаўкі. Калі па падобным дэпазіце прадугледжваецца 14% гадавых, то ў рэкламе можа быць прапісана, што першыя 6 месяцаў такая стаўка будзе заставацца фіксаванай.

## На кароткіх грашах шмат не заробіш

Калі вышэй мы разглядалі безадзыўныя рублёвыя ўклады на доўгія тэрміны, то дэпазіты да года адразу прапануюць меншыя працэнты. Звычайна стаўка на тэрмін да года складае ад 7 да 10%. Гэта пры тым, што і тут стаўка «плавае». Але самае цікавае, што банкі часам прапануюць нядрэнную даходнасць па мэтавых кампактных укладах, якія складаюць 2—3 месяцы. Існуе толькі некалькі сур'ёзных банкаў, якія могуць прапанаваць па дэпазіце на 3 месяцы фіксаваныя 9—12% гадавых. Адзыўныя ўклады тэрмінам да месяца маюць даходнасць ад 5% і ніжэй.

Тут таксама трэба ўдакладніць, што па дэпазітах на тэрмін да года (у айчыннай валюце) дзейнічае механізм падатказабкладання. Дакладней, дзяржава возьме падатак у памеры 13% з даходаў кліента, якія ён атрымае ад свайго кароткага ўкладу.

## У валюце — увогуле мізэр

Па доларавых дэпазітах банкі сёння прапануюць людзям да 2,5% гадавых. Гэта максімум, які прадугледжвае безадзыўны фармат укладу на 2 гады. Часам у невялікіх прыватных банках могуць узнікаць валютныя прадукты з нефіксаванай даходнасцю нават да 3% гадавых, але ў гэтых выпадках існуе вялікая верагоднасць, што ўжо праз месяц працэнты сур'ёзна падрэжуць у аднабаковым парадку. Па валютных укладах на тэрмін каля года ці ў адзыўным варыянце банкамі прапануецца ад 1 да 1,3% гадавых. Кароткія валютныя дэпазіты (ад 35 да 185 дзён) будуць мець даходнасць ужо менш за 1% (звычайна 0,75—0,8%) гадавых.

**Існуе толькі некалькі сур'ёзных банкаў, якія могуць прапанаваць па дэпазіце на 3 месяцы фіксаваныя 9—12% гадавых.**

Увогуле, практычна ўсе мае знаёмыя новыя ўклады ў валюце не адкрываюць. І справа тут не толькі ў маленькіх працэнтах. Асноўная замежная валюта (USD і еўра) за апошняе паўгоддзе нават патаннела.

## Знізілася даходнасць і па валютных аблігацыях

Яшчэ летась каштоўныя паперы ў валюце прыносілі іх уладальнікам нядрэнны даход. Уласныя валютныя аблігацыі сістэмных банкаў прадугледжвалі спачатку 5,5%, а потым 5% гадавых. Сёння падобных каштоўных папер з такой даходнасцю ўжо няма. Цяпер існуюць толькі валютныя аблігацыі на прад'яўніка ў некалькіх банках, але ўжо пад 4% гадавых. Праўда, на фінансавым рынку з'явіліся бездакументарныя каштоўныя паперы і інтэрнэт-аблігацыі ў валюце пад 5% гадавых. Аднак у насельніцтва яны пакуль вялікай папулярнасцю не карыстаюцца. Людзей сёння палохае той факт, што па гэтых каштоўных паперах у іх на руках ніякіх папяровых дакументаў не застаецца. А калі няма гэтай самай паперы, то і ў кліентаў часам узнікае ўражанне, што гарантыя вяртання іх грошай не зусім відавочная.

## Нерухомасць у інвестараў не ў трэндзе

Падзенне цэн на жыллё летась у нашай краіне прывяло да таго, што інвестыцыі ў нерухомасць былі стратнымі нават без уліку выдаткаў на абслугоўванне здзелак. Эксперты жыллёвага і камерцыйнага рынку нерухомасці прагназуюць, што крызіс у гэтай сферы яшчэ не намацаў канчатковае дно, і тэндэнцыя на зніжэнне цэн можа захоўвацца яшчэ некаторы час. Пераламаць яе можа рост даходаў насельніцтва, з'яўленне даступных крэдытаў на жыллё ці нарастанне дэфіцыту прапановы жылля ў сувязі з пэўнымі праблемамі фінансавання ў будаўнічай галіне. А пакуль атрымліваецца, што ўкладваць грошы ў нерухомасць на другасным рынку не зусім выгадна.

**Кароткія валютныя дэпазіты (ад 35 да 185 дзён) будуць мець даходнасць ужо менш за 1% (звычайна 0,75—0,8%) гадавых.**

Таму застаецца цалкам абгрунтаваны варыянт з банкаўскімі ўкладамі ў нацыянальнай валюце ці каштоўныя паперы ў тых жа рублях.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Шпацыр па Камароўцы

# КАЛІ ПРЫЛАЎКІ «ЗЕЛЯНЕЮЦЬ»

**Вясна ў сталіцы пачынаецца на рынках — зяленіва цвіце і пахне, заманьваючы пакупнікоў. За сто грамаў пятрушкі, кропу ці зялёнай цыбулі просяць 80 капеек, парэй каштуе 3 рублі за кіло. Ахвотнаму набыць сто грамаў шпінату прыйдзецца аддаць 2 рублі, за такі ж аб'ём рукалы просяць 3,50. Размарын і чабор аддаюць па 5 рублёў за сто грамаў. Зялёная салата каштуе 2 рублі за такі ж аб'ём.**

**Лічыльнік «Звязды»:**
*Сыр «Сметанковы»* — **8,30 (1 кг).**
*Масла «Сялянскае»* — **2,20 (200 г).**
*Алей «Залатая семка»* — **2,60 (1 л).**
*Рыс «Адборны»* — **1,25 (800 г).**
*Крупа грэцкая «Ядрыца»* — **1,90 (800 г).**
*Аўсяныя шматкі «Экстра»* — **0,65 (500 г).**
*Мука «Лідская»* — **1,80 (2 кг).**
*Тварог 9%* — **4,85 (1 кг).**
*Яйка Д1* — **1,85 (дзясятак).**
*Хлеб «Нарачанскі»* — **1,10 (0,6 кг).**

Павольна паўзуць уніз кошты на гародніну і садавіну. Так, вырашчаныя ў Ждановічах гуркі аддаюць па 2,50 рубля за кіло, таматы з гэтай жа гаспадаркі — па 2. За кіло белакачаннай капусты просяць 0,59 рубля, за каляровую — 3 рублі. Кілаграм кабачкоў аблегчыць кашалёк на 2 рублі, кіло баклажанаў — на 5 рублёў. Цэны на салодкія перцы вагаюцца ад 6,50 да 9,90 рубля. За кілаграм бульбы сорту «Уладар» просяць 0,53 рубля, кіло буракоў сорту «Бардо» абыдзецца ў 1,20 рубля. Цыбулю аддаюць па рублі, моркву — па 0,59, часнок аблегчыць кашалёк на 9,50 рубля. Падаюць кошты і на грыбы: шампіньёны каштуюць ад 3,50 да 4 рублёў, за кіло вешанак просяць каля 5 рублёў.

Заўважна патаннелі мандарыны, цяпер кілаграм гэтага фрукту каштуе ўсяго 2 рублі. Яшчэ танней можна набыць апельсін — егіпецкія аддаюць па 1,80 за кіло. Айчынныя яблыкі сорту «Алеся» адпускаюць па 1,30, «Ліго» — па 1,50. Вялікая груша гатунку «Генерал» скароціць бюджэт на 3,20 рубля. Вінаград «Рубін» абыдзецца ў 4,50 за кілаграм. Азербайджанскі гранат каштуе 3,80 рубля за кіло, ківі — 3,50. Эквадорскі банан аддаюць па 2,50. Калі хочацца экзотыкі, можна пакаштаваць манга па 2,50 за кілаграм ці, напрыклад, памела па 1,80.

Аматарам рыбы варта кіравацца да прылаўкаў з марожанымі «дарамі мора». Кілаграм скумбрыі абыдзецца ў 6,50 рубля, мінтая — 6,70 рубля, кефалі — 8 рублёў. Значна даражэй каштуюць фарэль і сёмга — 29 і 34 рублі за кіло адпаведна. Калі карціць пакаштаваць вэнджанай рыбы, можна ўзяць скумбрыю ці гарбушу, каштуюць яны аднолькава — 15,50 за кіло. 140-грамовая бляшанка ласасёвай ікры «пацягне» на 20 рублёў. А вось выбар свежай рачной рыбы зусім невялікі: або карп па цане ад 3,90 да 4,50 (у залежнасці ад памеру рыбіны), або таўсталобік па 3,21, або карась па 3,80.

Кілаграм свінога філею каштуе 19 рублёў, кумпяк — 9,50, за грудзінку просяць 7,80. Ялавічны філей абыдзецца нават танней — 18 рублёў, шыя — каля 10 рублёў, рэбры можна набыць за 7,90, а пячонку — за 10 рублёў. Аматарам дыетычнага мяса можна прапанаваць трусіка па 13,50 рубля за кіло або індычку па 14. Пры гэтым філей індычкі абыдзецца не нашмат даражэй — 16 рублёў. Курыца каштуе 13 рублёў за кіло, а самая дарагая птушка, як заўсёды, перапёлка — 30 рублёў за кіло. За кілаграм дамашняй паляндвіцы просяць 26 рублёў, салёнае дамашняе сала пацягне на 14,50. Курыны рулет з пятрушкаю аддаюць па 9,95 за кіло, столькі ж просяць за балыковую вяндліну. 7,99 рубля каштуюць кілаграм доктарскай каўбасы або цялячых сардэлек.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

## ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### АВІЯКАМПАНІЯ ПРАПАНУЕ СЭКАНОМІЦЬ НА ПАЛЁТАХ

**«Белавія» 27 і 28 лютага правядзе акцыю на палёты ў сакавіку і красавіку. Спецыяльныя цэны за пералёт туды і назад — 50 еўра плюс таксы і зборы.**

Як расказала **спецыяліст па сувязях з грамадскасцю авіякампаніі Вольга ШЧУКО,** акцыя стартуе 27 лютага ў 00.01 па мінскім часе, заканчваецца 28 лютага ў 23.59. Падарожжа, па ўмовах распродажу, павінна адбыцца з 1 сакавіка па 30 красавіка 2017 года (дата вяртання).

— Напрыклад, пералёт Мінск — Амстэрдам — Мінск па акцыі абыдзецца ў 118 еўра, Мінск — Барселона — Мінск — 117 еўра, Мінск — Сочы — Мінск — 81 еўра. Звычайная цана для такіх пералётаў па-за распродажам складзе мінімум 237 еўра для Амстэрдама, 286 еўра для Барселоны, 230 еўра для Сочы, — сказала прадстаўнік авіякампаніі.

Купіць білет па акцыі можна толькі на сайце belavia.by. Акцыя дзейнічае толькі на прамыя рэйсы «Белавія» і толькі на рэгулярныя маршруты. Такія напрамкі, як Масква, Санкт-Пецярбург, Кіеў, Тэль-Авіў, Бейрут і назад, не ўдзельнічаюць у распродажы.

Прапанова дзейнічае пры куплі білетаў як з Мінска, так і ў Мінск, толькі па маршруце туды — назад. Мяняць час і дату вылету нельга, білеты незваротныя. Колькасць месцаў па акцыі абмежаваная.

Пры адсутнасці акцыйных білетаў на выбраныя даты можна скарыстацца функцыяй «Каляндар тарыфаў» у раздзеле «Заказ білетаў».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

### ВАРОНА ПАБІЛА ШКЛО Ў МАШЫНЕ

У Брэсце камера відэаназірання зафіксавала, як варона кінула з вышыні нейкі прадмет, ён трапіў у лабавое шкло машыны і стаў прычынай трэшчыны. Гаспадыня машыны ранкам убачыла патрушчанае шкло і хацела ўжо звяртацца ў міліцыю, каб шукалі зламысніка. Машына стаяла недалёка ад пад'езда, над якім вісіць камера назірання. Пагледзелі запіс і вачам не паверылі: варона кідае зверху прадмет, ён трапляе на шкло машыны і адлятае на зямлю. Потым птушка спускаецца і забірае здабычу. Можна дапусціць, што гэта была нейкая ежа ў бляшанцы альбо слоічку, знойдзеная на сметніку. Такім чынам варона разбіла тару і павячэрала. А жыхарцы дома па вуліцы Калесніка давядзецца за свой кошт мяняць шкло. Варону ж да адказнасці не прыцягнеш.

...Тыдзень ці два таму на брэсцкіх сайтах паявіліся здымкі, як пугач, што паявіўся ў горадзе, з'еў ката. Усе тады шкадавалі коціка. Не намі сказана, што любоў і голад кіруюць светам. Але голад, відаць, трэба паставіць на першае месца.

### СНЯГУРКА ЗАСТАЕЦЦА, А ЗІМА АДЛЯТАЕ Ў АНТАРКТЫДУ

**Штогод у апошнія выхадныя лютага ў маёнтку беларускага Дзеда Мароза ладзілі праводзіны Снягуркі, якая накіроўвалася па Паўночны полюс. Зараз упершыню за 13 гадоў існавання сядзібы чароўнае сямейства аб'явіла пра перамены. Унучка пушчанскага чараўніка застаецца на ўсё лета ў рэзідэнцыі. А Матухна Зіма і тры яе дачкі збіраюцца ў падарожжа аж да далёкай Антарктыды.**

Перад дарогай Зіма правяла майстар-клас для ўнучкі Снягуркі, навучыла яе вышыўцы, вязанню, вырабу лялек-абярэгаў. Цяпер госці памесця змогуць набыць тут сувенір з бісеру, аўтарскую навагоднюю цацку, ляльку-абярэг.

А ключы ад сваёй майстэрні Матухна Зіма ўрачыста перадасць Снягурцы на свяце ў гэтую суботу. Сама ж накіруецца ў далёкае падарожжа на паветраным шары. Такі не зусім традыцыйны від транспарту выбраў сам гаспадар маёнтка. На беларускай станцыі «Гара Вячэрняя» ў Антарктыдзе ўжо гатовыя прыняць пасланцоў Дзеда Мароза, аб чым сведчыць відэазварот кіраўніка станцыі Аляксея Гайдашова, атрыманы нядаўна ў сядзібе.

Зварот паўтораць для ўсіх удзельнікаў свята праводаў Зімы ў суботу. Арганізатары абяцаюць шмат забавак, песні і танцы каля кастра, смачныя бліны ды іншыя пачастункі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

### НЕБЯСПЕЧНЫЯ ПАЕЗДКІ

**У Магілёве ДАІ шукае відавочцаў аварыі на праспекце Шмідта, дзе легкавы аўтамабіль «Опель» сутыкнуўся на сустрэчнай паласе з маршруткай, а потым урэзаўся яшчэ ў адзін «Опель».**



Ад удару маршрутнае таксі выехала на тратуар і перакулілася. 37-гадовы кіроўца і некалькі яго пасажыраў атрымалі траўмы. На шчасце, ніхто не загінуў.

Як паведамілі ва ўпраўленні ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама, вінаўнік ДТЗ з маршруткай, па папярэдніх даных, быў цвярозы. Па яго словах, яго падрэзалі, і ён вымушаны быў выехаць на сустрэчную паласу.

Працягваецца таксама пошукі сведак яшчэ адной дарожнай непрыемнасці ў Магілёве, якая адбылася 14 лютага ў салоне пасажырскага аўтобуса. Машына рэзка затармазіла на перакрыжаванні вуліц Першамайскай і Мігая, што прывяло да падзення аднаго з пасажыраў. Вас гатовы выслухаць па тэлефонах ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама 48-44-44, 46-44-44, якія працуюць кругласутачна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

**Отчет о деятельности Фонда «Экологический транспорт» (УНП 194902830) за 2016 г.**

Количество учредителей – 1 (Один)

Поступление денежных средств для осуществления уставной деятельности – 0 руб.

Иные, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, поступления – 0 руб.

Доход, полученный от осуществляемой в соответствии с Уставом деятельности, – 0 руб.

Стоимость имущества фонда на 31.12.2016г. – 31,77 руб., в т.ч.:

- остаток денежных средств на расчетном счете — 31,77 руб.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом для достижения общественно-полезных целей, в соответствии с Уставом Фонда –0 руб.

Количество унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных Фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в т.ч. участие Фонда в таких юридических лицах – 0 (ноль).

УНП 194902830

**ОТЧЕТ** УНП 290460165

**Местного фонда «Центр поддержки сельского развития и предпринимательства Столинского района» об использовании своего имущества за 2016 год.**

Количество учредителей Фонда – 18, в том числе 15 физических лиц.

Стоимость имущества Фонда, в том числе:

- переданного учредителями фонда – 410,00 рубля,

- поступления от проводимых в соответствии с Уставом Фонда мероприятий 295 538,82 рубля,

- доходы от предпринимательской деятельности 1 204,49 рубля,

- иные поступления, не запрещенные законодательством, – 145 778,04 рубля.

Сумма расходов понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его Уставе составила 396 573,67 рубля.

Фонд является учредителем унитарного предприятия «Сельская Столинщина», зарегистрированного в Едином государственном регистре за №291046099 26 сентября 2011 года.

Фонд не является участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах и коммерческих организациях